# Эсэ “Хіба можна такое забыць?”

Дзяцінства – самы бесклапотны час у жыцці чалавека. Блакітнае неба над галавою. Побач мама і тата. Самыя лепшыя, самыя добрыя ўспаміны мы звязваем з дзяцінствам. Але было пакаленне, для якога напамін аб дзяцінстве звязаны з невыносным болем, жахам, адчаем. На долю гэтых дзяцей выпалі вельмі цяжкія выпрабаванні. Замест школьных парт яны бачылі смерць, разбурэнні, пакуты родных і блізкіх людзей. Гэта – дзеці вайны. Разам з дарослымі яны ішлі з занятых або спаленых фашыстамі вёсак у партызанскія атрады, станавіліся сувязнымі, сынамі палкоў, разведчыкамі, збіралі звесткі пра ворагаў.

Дзеці і вайна… Страшнае спалучэнне гэтых слоў і па сённяшні дзень узнікае раптоўна, каб абпаліць, спыніць, каб перасцерагчы… Ёсць выслоўе: “На вайне дзяцей не бывае”. Тыя, хто трапілі на вайну, павінны былі развітацца з дзяцінствам і не па гадах стаць дарослымі. У іх дзяцінстве былі бамбёжкі і бамбасховішчы.

Гэта яны працавалі замест дарослых.

Гэта дзеці вайны вучыліся пры свечках і газавых лямпах, пісалі на газетах ці шматках шпалераў замест сшыткаў.

Гэта яны гінулі ў фашысцкіх канцлагерах, паміралі ад ран, ад голаду.

Час ідзе няўмольна. Семдзесят восем вёснаў адмяжоўваюць нас, маладое пакаленне, ад вясны 1945 года. Амаль цэлае жыццё прайшло з таго часу. З кожным годам усё менш застаецца тых, хто ваяваў, хто здабываў Перамогу. Нашы прабабулі і прадзядулі – апошнія сведкі, хочацца верыць, апошняй вайны на зямлі. Перажытае ў дзяцінстве ўсё жыццё суправаджае іх, не дае спакою. Іх успаміны – гэта крык душы, стогн сэрца, гэта напамін нам, каб у будучым не паўтарыліся жахі вайны.

Адна з такіх сведкаў – мая прабабуля…

Перада мною партрэт вельмі прыгожай жанчыны. Ласкавы позірк, усмешлівыя вусны, неглыбокія маршчынкі… Я зноў і зноў углядаюся ў такія знаёмыя і родныя рысы аблічча маёй мілай прабабулечкі.

Прайшлі гады, як не стала нашага дарагога чалавека. Але яна з намі, жыве ў нашай памяці, з’яўляецца ўзорам і прыкладам сумленнага жыцця.

Я часта ўзгадваю нашы сустрэчы, гутаркі. Цікавіла мяне ўсё, але больш за ўсё хацелася даведацца ад прабабулі пра яе жыццё ў час вайны. Радаснае, бесклапотнае маленства скончылася ў адзінаццаць гадоў. Не трэба было мне чытаць творы пра вайну, глядзець мастацкія стужкі… Прабабуліны ўспаміны – найлепшы матэрыял для стварэння цікавых помнікаў кіно, літаратуры, скульптуры…

Я захаплялася яе вынослівасцю, мужнасцю. У такім узросце клапацілася пра сябе і іншых. Часта задумвалася: “А ці змагла б я так зрабіць? Хто з маіх аднакласнікаў здольны на такое?”

З успамінаў маёй прабабулі:

“У 1943 годзе мой бацька пайшоў у партызаны. Праз некаторы час у вёску прыехалі немцы, каб забраць сям’ю. А на вуліцы стаялі восеньскія пагодлівыя

дзянькі. Калі немец загадаў маці збірацца, то яна незаўважна шапнула мне: “Ты ж большанькая, паспрабуй уцячы, бо больш шансаў выжыць не будзе!”. І яна піхнула мяне ў плечы. Разгубленая, спалоханая, я выскачыла на вуліцу і забегла да суседкі. А там былі паліцаі. Я памкнулася назад … Наступіў крытычны момант… Што рабіць?.. І я мусіла бегчы за хлявы. Адразу ж пачула за спіною трэск аўтамата і свіст куль над галавою. Толькі наперад! Назад дарогі не было. Так я трапіла ў лес, а затым – у партызаны. А маці, сястру і двух брацікаў я ўжо больш не бачыла. А потым ужо, калі вярнулася з партызанаў, людзі казалі, што іх павезлі ў бок Слуцка, там і расстралялі…

Не магу нават і цяпер уявіць, колькі ж прыйшлося мне, маленькай дзяўчынцы, перажыць у партызанах! Я ішла след у след за чужымі людзьмі па лесе, па балоце, па снезе, адмарожваючы ногі і рукі, пазіраючы ў вочы, каб нехта нешта даў з’есці, абуць, адзець... І давалі…, і не пакінулі…, і дапамаглі выжыць. А калі скончылася вайна, мне было 15 гадоў.

Я вярнулася ў родную хату. Доўга яшчэ чакала сваіх родных, але так і не дачакалася. Стварыла сваю вялікую дружную сям’ю. Нарадзіла пяцёра дзяцей. За ўсіх: за сястру, за братоў, за тых, хто загінуў…”.

Прайшоўшы праз такія выпрабаванні, дзяўчынка з тых горкіх ваенных гадоў умела радавацца жыццю і несла радасць людзям. У яе хапала часу на ўсё: на сям’ю, на працу, на заняткі. Прабабулечка любіла кветкі, кнігі, чысціню ў доме. Яе стрыманасць, уменне быць заўсёды прыгожай, дагледжанай вядомы многім маім землякам.

Яна – прыклад той жанчыны, якая, прайшоўшы праз цяжкія жыццёвыя выпрабаванні, не страціла выдатных чалавечых якасцяў.

Памятаю, як прабабуля гаварыла, што ўсё патрэбна рабіць сумленна, любіць сваю справу, малую радзіму, людзей. А на маё пытанне: “Якая рыса характару ў чалавека самая важная?”, - яна адказала: “Духоўная прыгажосць”. Я вельмі ганаруся сваёй прабабуляй. Яе жыццё – узор для мяне.

Прайшло шмат часу… На змену адным пакаленням прыйшлі другія. Час бяжыць, змяняюцца людзі, іх светапогляды і адчуванні. Змяняемся і мы. Але адзінае, што нас яднае, – гэта патрыятызм і любоў да Бацькаўшчыны, да Беларусі. Нашы прабабулі і прадзядулі памятаюць, у якім цяжкім становішчы апынулася Беларусь адразу пасля вайны. Здавалася, што яна ніколі не выйдзе з гэтай багны. І толькі дзякуючы трываласці, цярплівасці і сіле волі, уласцівым нацыянальнаму характару, ужо ў канцы саракавых гадоў былі дасягнуты першыя поспехі ў народнай гаспадарцы, пакорана першая прыступка лепшага жыцця. Застаецца дзівіцца толькі мужнасці і стойкасці беларускага народа. Нізка кланяючыся подзвігу беларусаў, я з гонарам кажу: “Я – грамадзянка Беларусі!”.

З цягам часу, паступова боль сціхае, і беларускі народ, нягледзячы на ўсе зведаныя пакуты і радасці, крочыць далей. Шмат было прыкладзена намаганняў для таго, каб мы зараз з асалодаю маглі прайсціся па чыстай, шырокай вуліцы, каб кожная новая сям’я магла мець не толькі дах над галавой, але і сучасную бытавую тэхніку, каб дзеці змаглі атрымаць выдатную адукацыю, каб мы адчулі, што такое шчасце і мір не толькі за сябе, але і за тых, хто загінуў на фронце,

тых, хто загінуў, змагаючыся за лепшае жыццё ў мірны час. Мы, нашчадкі, будзем заўсёды помніць пра ўсё, бо мы – няскораны, вольналюбівы, горды і працавіты народ. Мы – грамадзяне сваёй краіны! Мы – гэта той востраў стабільнасці ў бязмежным акіяне чалавечых хваляванняў і заган. Мы, беларускі народ, шчыра клянёмся табе, Беларусь, у любові!..

Мне зараз 16 гадоў. Кажуць, самы цудоўны ўзрост, таму што наперадзе цэлае жыццё. У мяне і маіх аднакласнікаў столькі планаў, якія так хочацца здзейсніць! І я веру, што нам многае ўдасца, таму што побач ёсць клапатлівыя бацькі, якія хочуць бачыць нас шчаслівымі; добрыя настаўнікі, якія шчодра перадаюць нам свае веды.

Я таксама збіраюся зрабіць усё, дзеля таго, каб і мае дзеці потым з гонарам, як і я цяпер, шчыра прамовілі: “Я – грамадзянін Беларусі.”